© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Рабіць аборты не забараняецца (стар. 2)
Куды адправіць дзіця на адпачынак? (стар. 4)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік Павел Жук
Наклад 36 220
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 2 362 441

Серада, 4 чэрвеня 1997 № 59 Кошт свабодны

Беларускі дыпламат папрасіў палітычнага прытулку

Як паведамілі французскія сродкі масавай інфармацыі, беларускі дыпламат Уладзімір Палупанаў папрасіў палітычнага прытулку ў Францыі.

У французскай амбасадзе ў Мінску, а таксама ў прэс-службе беларускага знешнепалітычнага ведамства сказалі, што афіцыйнага пацверджання гэтага факта яшчэ няма.

Уладзімір Палупанаў, былы другі сакратар беларускага пасольства ў Парыжы, раней з'яўляўся сакратаром міністра замежных справаў Беларусі. Ён скончыў мінскі інстытут замежных моваў, нейкі час працаваў перакладчыкам на Мадагаскары, потым у аддзеле народнай адукацыі Заслаўскага гарвыканкама. Родам з Любанскага раёна, мае дваіх дзяцей. Уладзімір Палупанаў уступіў у Беларускую сацыял-дэмакратычную грамаду і выпучаўся кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета. Быў адным з арганізатараў першага з'езду беларусаў свету ў Мінску ў 1993 г.

У інтэрв'ю *Radio France International* Уладзімір Палупанаў сказаў, што *«апошнім штуршком для просьбы палітычнага прытулку стала падпісанне дамовы аб аб'яднанні Беларусі і Расіі. Я выбраў свабоду і хачу адкрыта працягваць сваю дзейнасць у Францыі»*, — заявіў У.Палупанаў.

Алесь ДАШЧЫНСКІ

Лінг збіраецца падагрэць адносіны з Польшчай

У хуткім часе магчымы візіт беларускай урадавай дэлегацыі ў Рэспубліку Польшча.

Пра гэта на брыфінгу паведаміў прэс-сакратар беларускага прэм'ера Дзмітрый Маліноўскі. Па яго ных словах, падчас урачыстасцяў у Гаазе, прысвечаных 50-годдзю плана Маршала, у С.Лінга адбылася сустрэча з прэзідэнтам Польшчы Аляксандрам Квасьнеўскім, на якой абмяркаваныя пытанні двухбаковых адносінаў. Па інфармацыі прэс-сакратара, падчас сустрэчы прэзідэнт А.Квасьнеўскі паведаміў, што ён прыме рашэнне аб арганізацыі рабочага візіту прэм'ер-міністра Беларусі С.Лінга ў Польшчу.

На думку экспертаў, гэты візіт можа мець вялікае значэнне, калі ўлічваць, што апошнім часам адносіны паміж дзвюма краінамі былі дастаткова «прахалодныя».

БелаПАН

У Віцебску абакралі латвійскага консула

На мінулым тыдні ў Віцебску была абрабаваная кватэра консула Латвіі Арманда Круззэ.

Злодзеі забраліся ў дом дыпламата ў той час, калі сп.Круззэ з жонкай паехалі на адпачынак за горад. Вярнуўшыся дахаты, гаспадары заўважылі, што з кватэры зніклі два тэлевізары, каштоўнае футра і іншае адзенне. Скрадзенае таксама фамільнае золата і срэбра, таму сп.Круззэ кажа, што маральны ўрон значна большы за матэрыяльны.

Следства па факце абрабавання кватэры латвійскага дыпламата вядзе віцебскае абласное ўпраўленне ўнутраных справаў. Сам сп.А.Круззэ лічыць, што ён і яго сям'я сталі ахвярамі звычайных крымінальных злодзеяў, якія даўно сачылі за домам.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

Пастанова суда ў паштовай скрыні

Генадзя Карпенку аштрафавалі на 19,5 мільёнаў — завочна

Рашэннем суда Савецкага раёна Мінска вядомы палітык, намеснік старшыні Вярхоўнага Савета Генадзь Карпенка аштрафаваны на 150 мінімальных зарплат, або на 19,5 мільёна рублёў. Судовы працэс адбыўся яшчэ 14 траўня, але аб яго выніках Г.Карпенка даведаўся толькі 31 траўня, калі, вымаючы са сваёй паштовай скрыні свежыя газеты, знайшоў сярод іх і копію судовай пастановы. У гэтым дакуменце ўказваецца, што судовае паседжанне пераносілася тры разы, паколькі абвінавачваемы на яго не з'яўляўся, а міліцыя не змагла забяспечыць яўку Карпенкі ў суд.

14 траўня суд, абвінаваціўшы віцэ-спікера парламента ў парушэнні прэзідэнцкага дэкрэта №5 і пастановы Мінгарвыканкама, аштрафаваў Г.Карпенку за арганізацыю мітынгу 15 красавіка і шэсця па вуліцах сталіцы. Як вынікае з пастановы суда, сурадзь Карпенкі сведчылі супрацоўнікі міліцыі Радзівончык, Бельскі і Асмалоўскі. Сам падсудны і яго адвакат удзелу ў працэсе не прымалі.

Г.Карпенка паведаміў, што ён два месяцы хварэў, лячыўся ў стацыянары, таму аб'ектыўна не мог з'явіцца ў суд. Жонка Генадзя Дзмітрыевіча некалькі разоў папярэджвала суд аб хваробе мужа па тэлефоне. Аднак суддзі на гэта не адрэагавалі, паколькі, як лічыць Г.Карпенка, якраз 14 траўня заканчваўся двухмесячны тэрмін, пасля якога яго ўжо не маглі прыцягнуць да адказнасці. *«Суддзі цягнулі да апошняга, потым наладзілі завочнае судзілішча»*, — пракаментаваў Генадзь Карпенка. Ён мае намер абскарджаць рашэнне суда ў гарадской пракуратуры.

БелаПАН

Перад кансультацыямі

Кансультацыі паміж прадстаўнікамі Вярхоўнага Савета і прэзідэнта пры пасярэдніцтве місіі Еўрапейскага Саюза ў папярэдне вызначаны дзень — 29 траўня — не пачаліся па віне прэзідэнцкага боку. Новая дата — 16 чэрвеня.

«Ужо першыя крокі Лукашэнкі пасля фармальнай згоды ўдзельнічаць у кансультацыях сведчаць пра тое, што рэжым будзе цягнуць час і дыскрэдытаваць саму ідэю перамоваў», — гаворыцца ў распаўсюджанай днямі заяве кіраўніцтва БНФ «Адраджэнне». — *Любыя кансультацыі з рэжымам маюць сэнс толькі ў тым выпадку, калі прававой асновай для іх будзе легітымная Канстытуцыя 1994 г.»*

Кіраўніцтва Народнага Фронту таксама заяўляе, што перамовы з уладамі можна весці толькі пасля вызвалення з-пад варты ўсіх палітычных вязняў, спынення крымінальных і адміністратыўных справаў супраць удзельнікаў акцыяў пратэсту і адмены ранейшых прыгавораў, адмены прэзідэнцкага дэкрэта № 5 і іншых антыканстытуцыйных актаў Лукашэнкі, пры магчымасці рэгулярнага доступу дэпутатаў Вярхоўнага Савета і прадстаўнікоў пазапарламенцкай апазіцыі на Беларускае тэлебачанне.

*Працяг тэмы — на стар. 2. Чытайце артыкул Віталя Цыганкова **«Не трапіць у пастку на перамовах»**.*

Вярхоўны Савет на перамовах будуць прадстаўляць тры «зубры» беларускай палітыкі. Пётр Краўчанка (злева) мае багаты дыпламатычны досвед. Генадзь Карпенка (у цэнтры) — вядомы сваёй настойлівасцю і прынцыповасцю. Мечыславу Грыбу прыдасца генеральская рашучасць і вытрымка.

Страйк трактарыстаў

Дапякло і калгаснікам

На мінулым тыдні адмовіліся прыступіць да работы трактарысты калгаса «Сцяг кастрычніка» Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці. Яны патрабавалі ад кіраўніцтва гаспадаркі выплаціць ім зарплату за тры папярэднія месяцы.

Толькі пасля таго, як калгасная адміністрацыя паабяцала забастоўшчыкам знайсці і выплаціць грошы ў бліжэйшыя дні, трактарысты выехалі на палеткі, але папярэдзілі начальства, што страйк будзе аднолены, калі яно не стрымае дадзенага слова. Арганізаваны дзеянні калгаснікаў далі вынік. Па словах старшыні раённага аграпрама Аляксандра Лапаткі, запазычанасць па зарплаце была ліквідавана на працягу двух дзён.

Гэты страйк стаў першай акцыяй працаўнікоў аграрнага сектара ў абарону сваіх правоў. Дагэтуль калгаснікі не вырашаліся прыбягаць да падобных формаў пратэсту, хацяў многіх гаспадарках краіны людзі месяцамі не атрымліваюць зарплаты.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

Хутка будзе прысуд

Віцебскім абласны суд працягвае слуханні па справе паэта Славаміра Адамовіча.

На думку адваката Гары Паганяйлы, мяркуюць, што ўжо на гэтым тыдні будзе абвешчаны прысуд. Як вядома, С.Адамовічу інкрымінуецца парушэнне адразу трох артыкулаў Крымінальнага кодэкса. Найбольш істотнае — абвінавачанне ў закліках да ўчынення тэрарыстычнага акту ў дачыненні да вышэйшай службовай асобы краіны — гаворка ідзе пра верш «Убей президента», апублікаваны ў віцебскай газеце «Выбар».

БелаПАН

Выстава года

Так называюць свой праект арганізатары першай у Беларусі экспазіцыі твораў Марка Шагала

Падзея сапраўды значная. Падрыхтоўка да выставы, прысвечанай 110-м угодкам з дня нараджэння сусветна вядомага мастака, ішла больш за пяць год, а адчыніцца яна заўтра, 5 чэрвеня, у Нацыянальным мастацкім музеі. Да 29 чэрвеня экспазіцыю «Міжземнаморскія творы 1949—1985» можна будзе паглядзець у беларускай сталіцы, а потым яна адправіцца на радзіму Шагала. Там, у Віцебску, пройдзе Другі Міжнародны шагалаўскі фестываль і пленэр. У Віцебскім мастацкім музеі выстава будзе знаходзіцца да 20 ліпеня. Яна складаецца з 60 літаграфій, 8 гуашавых малюнкаў і 4 акварэляў, якія прадастаўленыя музеем Марка Шагала ў Ніцы і ягонымі нашчадкамі з Швейцарыі і Францыі.

Па словах намесніка міністра культуры Уладзіміра Рылаткі, як беларускі, так і французскі бакі прыклалі шмат намаганняў, каб рэалізаваць гэты праект. Міністэрства замежных справаў Францыі, напрыклад, узяло на сябе транспарціроўку шэдэўраў пад узброенай аховай з Ніцы ў Мінск праз Хельсінкі, прафінансавала прыезд у беларускую сталіцу вядомага спецыяліста па творчасці Марка Шагала і галоўнага захавальніка Музея сучаснага мастацтва ў Парыжы Даніэля Маршэсо. Сям'я Шагала таксама праявіла цікавасць да святкавання яго 110-х угодкаў і ўзяла непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы выставы. Арганізатары чакаюць прыезду з ЗША ўнучкі Шагала — Мээр. Пра гэта паведаміў саветнік па культуры французскай амбасады ў Беларусі Франсуа Ларан.

Галоўным спонсарам святкавання шагалаўскіх угодкаў і выдання каталога стала тытунёвая кампанія *Philip Morris*. (Дарэчы, на прэс-канферэнцыі, якая праводзілася на мінулым тыдні і на якой журналістам расказалі пра падрабязнасці праекта, было вывешана тры сцягі: самы вялікі — фірмовы *Philip Morris*, крыху меншы — Францыі і зусім невялічкі — чырвона-зялёны беларускі). Між іншым, *Philip Morris* фінансуе мерапрыемствы такога кшталту ўжо не ў першы раз. Пяць год таму тытунёвы гігант ужо быў спонсарам выставы шагалаўскіх твораў з прыватных калекцый у Фінляндыі. Потым фірма падтрымлівала яшчэ выставы твораў Казіміра Малевіча, Пабла Пікаса і Сальвадора Далі.

Не засталіся ў баку ад 110-гадовага юбілея Марка Шагала і беларускія ўлады: на рэстаўрацыю маленькага доміка мастака ў Віцебску і стварэнне ў ім музея яны выдзелілі 4 мільярды рублёў. На вялікі жаль, сёння ў нашай краіне ад Шагала засталося няшмат: толькі домік на Пакроўскай вуліцы ў Віцебску і аўтограф мастака, які захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы. У Беларусі няма работ сусветна вядомага мэтра, яна не стала яго апошнім прытулкам (Марк Шагал пахаваны ў Францыі, у Сэн-Поль-дэ-Ванс). Але ў Беларусі ёсць законнае права называцца радзімай вялікага Шагала.

Марына РАССАФОНАВА

КАНТРОЛЬ

Падатковая інспекцыя хоча ведаць усё

Нават кожны рубель на вашым прыватным рахунку

Дзяржаўны падатковы камітэт накіраваў у Нацыянальны банк і камерцыйныя банкі ліст, у якім патрабуе, каб банкі кожны месяц перадавалі ў падатковыя органы звесткі аб паступленнях на рахункі грамадзянаў і прыватных прадпрымальнікаў сум, што перавышаюць 500 мінімальных зарплат, — у тым ліку з-за мяжы. У лісце ДПК тлумачыцца, што гэтыя захады робяцца *«ў мэтах абароны эканамічных інтарэсаў дзяржавы»* і *«ў рамках арганізацыі выканання»* прэзідэнцкага дэкрэта № 2.

Між тым, паводле агульнапрынятай практыкі, стан рахунка з'яўляецца прыватнай таямніцай уладальніка, і адпаведны пункт нярздка запісваецца ў тэкст умовы паміж банкам і кліентам. Гэтая ініцыятыва падатковых органаў не толькі закранае правы грамадзян, але і зніжае давер укладчыкаў да беларускіх банкаў, у выніку чаго толькі ўзмоцніцца тэндэнцыя вывазу грошай для размяшчэння іх за мяжой.

Алесь САДОЎСКІ

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Рабіць аборты не забараняецца

Гэта пацвердзіла начальнік аддзела мацярынства і дзяцінства міністэрства аховы здароўя Зінаіда Сяўкоўская

Па яе словах, усялякія чуткі наконт забароны абортаў не маюць пад сабой падставаў. Ніякіх распараджэнняў на гэты конт у міністэрстве не рыхтуецца. Кожная жанчына (пры тэрміне цяжарнасці да 12 тыдняў) мае права бясплатна зрабіць аборт у медыцынскай установе. Пасля 12 тыдняў прымаюцца да ўвагі спецыяльныя паказанні, паводле якіх цяжарнасць можа быць спынена.

Колькасць абортаў у Беларусі значна большая, чым у цывілізаваных краінах. На 100 нараджэнняў, па словах З.Сяўкоўскай, у нас прыпадае 160 абортаў. Зінаіда Сяўкоўская падкрэсліла карэспандэнту СВАБОДЫ, што аборт — гэта зневажальная і непрыемная працэдура, якая адмоўна дзейнічае на псіхалагічнае і фізічнае здароўе жанчыны. Таму ў першую чаргу пра здароўе жанчын павінны паклапаціцца мужчыны.

Аднак складаная эканамічная сітуацыя прыводзіць да таго, што многія мужчыны і жанчыны не ў стане набыць сродкі кантрацэпцыі (папярэджання цяжарнасці): таблеткі каштуюць 60—80 тысяч, прэзерватывы — да 5 тысяч рублёў. Акрамя таго, адбіваецца і нізкі ўзровень санітарнай культуры.

Па словах Зінаіды Сяўкоўскай, у Беларусі *«аборт застаецца асноўным метадам рэгулявання нараджальнасці»*. Па дадзеных міністэрства аховы здароўя, у нашай краіне ўсё яшчэ здараюцца так званыя крымінальныя аборты, калі жанчына робіць аперацыю па-за лячэбнай установай.

М.В.

Восень – час поўнай «кока-колы»

Будаўніцтва завода кампаніі *Coca-Cola* ў Калядзічах пад Мінскам плануецца завяршыць да восені.

Пра гэта паведамілі ў кіраўніцтве СП «Кока-Кола Амаціл Беларусь». Да пачатку восені плануецца і пуск вытворчасці. Ніякіх асаблівых праблем пры будаўніцтве завода кампанія не зведвае, ужо поўным ходам ідзе наладка тэхналагічнага абсталявання.

Нагадаем, што СП «Кока-Кола Амаціл Беларусь» было створана ў 1993 годзе і з'яўляецца буйнейшым вытворцам безалкагольных напояў на тэрыторыі рэспублікі. Статутны фонд сумеснага прадпрыемства складае 20 мільёнаў долараў, і кампанія мае намер яго павялічваць. На працягу 1997-1999 гадоў «Кока-Кола» плануе інвеставаць у развіццё эканомікі Беларусі 60-70 млн. долараў.

На выставу ў Італію

Беларуская гандлёва-прамысловая палата арганізуе ўдзел беларускіх прадпрыемстваў, арганізацый і фірмаў у 49-м Міжнародным універсальным кірмашы ў Трыесце (Італія) з 20 па 29 чэрвеня.

Паводле папярэдняй інфармацыі, удзельнікамі кірмашу будуць больш як 10 беларускіх прадпрыемстваў і фірмаў, у тым ліку знешнегандлёвае прадпрыемства «Белпрамімпекс» міністэрства прамысловасці, Нацыянальны турыстычны канцэрн «Белінтурыст», народнае прадпрыемства «Пінскдрэў», адкрытае акцыянернае таварыства «Мастра», прадпрыемства «КС-Лён» і іншыя. У рамках выставы плануецца правесці Дзень Беларусі прэзентацыяй беларускіх вытворцаў і іх тавараў. Будуць арганізаваныя сустрэчы з бізнесменамі з паўночных абласцей Італіі, зацікаўленымі ва ўстанаўленні кантактаў з беларускімі вытворцамі.

БелаПАН

ПАЛІТЫЧНАЯ ТАКТЫКА

Не трапіць у пастку на перамовах

Віталь ЦЫГАНКОЎ

Перамовы паміж прадстаўнікамі прэзідэнта, апазіцыі і Еўрасаюза адкладзеныя да 16 чэрвеня. У дэпутатаў Вярхоўнага Савета ёсць час канкрэтна вызначыць, чаго яны хочуць дамагчыся.

Дарэчы, ужо сам факт пераносу даты кансультацыяў павінен насцярожыць прадстаўнікоў апазіцыі. Афіцыйнай версіяй, як вядома, стаў замежны візіт кіраўніка прэзідэнцкай дэлегацыі Івана Антановіча ў Партугалію. Відавочна, аднак, што пасада Антановіча вымушае бываць ў замежных камандзіроўках (ведама ж, вельмі важных і адказных) даволі часта — і хто можа гарантаваць, што наступная паездка па нейкай «выпадковасці» не прыпадзе акурат на 16 чэрвеня?

Зрэшты, ёсць і іншая, «неафіцыйная» версія нечаканага — за дзень да пачатку — пераносу перамоваў. Аляксандр Лукашэнка (што ён ускосна і пацвердзіў на сваёй прэс-канферэнцыі ў мінулы чацвер) вылучыў патрабаванне, каб ад дэпутацкага боку былі прадстаўленыя не толькі апазіцыянеры з Вярхоўнага Савета (49 чалавек), але і жыхары «палаты» (110) разам з тымі, хто там там хоча прапісацца (40). Еўрапейцы не згадзіліся з такім раскладам і адмовіліся прыехаць у Мінск. Паўтаруся, гэта толькі версія, якую не пацвярджае ніхто з будучых «перамоўцаў». Але вышэйпамянёная заява Лукашэнкі дае падставы для падазрэнняў, што, сеўшы за круглы стол, прэзідэнцкія прадстаўнікі пачнуць ставіць пад сумненне склад парламенцкай дэлегацыі.

Праграмы-максімум для кожнага з бакоў дастаткова відавочныя. Дэпутаты хацелі б узнавіць у краіне дзейнасць Канстытуцыі 1994 года і, адпаведна, паўнавартую легітымнасць Вярхоўнага Савета. Прэзідэнт сваёй галоўнай задачай бачыць прызнанне міжнароднай супольнасцю вынікаў рэферэндуму 1996 года і створаных у выніку заканадаўчых структураў улады. Еўрасаюз жадае стабілізаваць нарэшце палітычную сітуацыю ў Беларусі, вытрымаўшы стандарты дэмакратыі і правоў чалавека.

Калі мэта перамоваў больш-менш вядомая, то стратэгія яе дасягнення застаецца для грамадскасці вялізнай таямніцай. На маю просьбу распавесці штонебудзь пра тактыку паводзінаў дэпутатацкай «тройкі» Пётр Краўчанка адрэагаваў даволі раздражнёна. Я ледзь не адчуў сябе агентам, які хоча выкрасці сакрэтную формулу імгненнай палітычнай пагібелі узурпатара і адразу ж прадаць яе за пэўную суму. Але Краўчанка не выдаў гэтую аднаму яму вядомую формулу. *«Стратэгія адна — каб перамагла дэмакратыя»*, — адказаў ён. Што ж, гэта правільная лінія. Я, дарэчы, на валоданне гэтай таямніцай не прэтэндую, мне галоўнае — ўпэўніцца, што стратэгія сапраўды ёсць.

Здаецца, усе ўдзельнікі перамоваў разумеюць, што падчас сустрэчаў хутчэй за ўсё давядзецца ісці на нейкія саступкі. Той жа П.Краўчанка заявіў «Белорусской газете»: *«Звышзадачай было б аднаўленне ў поўным аб'ёме дзейнасці Канстытуцыі 1994 года. Аднак мы рэалісты і разумеем, што дабіцца гэтага будзе вельмі складана»*. У той жа час Генадзь Карпенка падкрэсліў, што вынікі рэферэндуму не могуць быць прызнаныя нават у якасці кансультатыўных. І дэпутаты, і еўрапейскія назіральнікі настойваюць на тым, што змены ў Канстытуцыю павінны прымацца адзіным законным парламентам — Вярхоўным Саветам 13-га склікання.

Аднак тут некаторыя аналітыкі папярэджваюць аб існаванні адной прыхаванай пасткі. Прадстаўнікі адміністрацыі прэзідэнта раптоўна для многіх пагаджаюцца правесці паседжанне Вярхоўнага Савета. Збіраюцца ўсе 190 дэпутатаў — і на першым жа паседжанні, напрыклад, Анатоль Малафееў зачытвае дакумент, у якім 150 дэпутатаў выказваюць сваю падтрымку прэзідэнцкага варыянта Канстытуцыі. Праект, які быў на рэферэндуме, ставіцца на галасаванне і прымаецца пераважнай большасцю ў тры чвэрці — 150 галасоў (110 з палаты прадстаўнікоў плюс 40 «прэтэндэнтаў»). Такім чынам, легітымны ВС цалкам дэмакратычна прымае прэзідэнцкую Канстытуцыю з адной невялічкай папраўкай — у «палаце прадстаўнікоў» замест 110 дэпутатаў будзе 150. Пры гэтым той праект Канстытуцыі, які прывезлі еўрапейцы, Вярхоўным Саветам будзе зноў-такі, так бы мовіць, «дэмакратычна» адхілены.

Другая пагроза падчас перамоваў — гэта магчымае незадавальненне іншых апазіцыйных сілаў. Усю рознакаляровую апазіцыю рэпрэзентуюць тры дэпутаты Вярхоўнага Савета — безумоўна, яны не могуць прадстаўляць усю разнастайнасць патрабаванняў грамадства. Праўда, прэзідыум ВС стварыў кансультацыйную групу, якая павінна дапамагаць тром дэлегатам ад парламента (у яе ўвайшлі Ю.Хадыка, Ю.Захаранка, М.Пастухоў і іншыя палітыкі). Але ў гэтую групу, натуральна, не маглі ўвайсці прадстаўнікі усіх партый, праваабарончых арганізацыяў і г.д. Вынік перамоваў можа быць расцэнены негатыўна, напрыклад, кіраўніцтвам БНФ альбо часткай шараговых членаў Фронта.

Чалавеку ўласціва памыляцца. Г.Карпенка, М.Грыб, П.Краўчанка таксама людзі (як і С.Шарэцкі або В.Ціхіня ў лістападзе 1996), і яны могуць «спакусіцца» на нейкую падманную перспектыву. Да таго ж «наменклатурныя» інтарэсы дэпутатаў (у нармальным, службовым сэнсе гэтага слова) не заўсёды супадаюць з «народнымі» інтарэсамі партый і праваабарончых арганізацый. Дэпутатам, можа, важней аднавіць Вярхоўны Савет, а партыям — спыніць прававую дыктатуру, абараніць пратэстуючых людзей. Прафесар Аляксандр Патупа лічыць, што дэпутаты павінны перад пачаткам перамоваў выставіць некалькі папярэдніх умоваў — напрыклад, адмену некаторых самых адыёзных прэзідэнцкіх дэкрэтаў.

Прызнаемся, гаварыць пра поўнае аднаўленне Канстытуцыі 1994 года сёння, сапраўды, маларэальна. Прызнаемся таксама, што фактычна Лукашэнка вядзе перамовы не з беларускай апазіцыяй, а з Еўропай. Таму нашаму грамадству хацелася б ведаць адказы на некаторыя пытанні. Як адрэагуе Еўропа, калі перамовы праваляцца? Дзе тая мяжа патрабаванняў, перад якой не павінна быць ніякіх саступак? Якой глыбіні могуць быць гэтыя саступкі? Якія пазіцыі гатовыя «здаць» дэпутаты у абмен на пэўнае прэзідэнцкае адступленне?

Я магу сабе дазволіць не ведаць адказаў на гэтыя пытанні. Але я хачу быць упэўнены, што адказы на іх маюць спадары Карпенка, Краўчанка і Грыб. Вельмі не хацелася б, каб праз некалькі месяцаў на мітынгах людзі пачалі казаць «здраднік» і на адрас гэтых паважаных людзей...

СВАБОДА З ВАМІ ДА КАНЦА ГОДА

Газету СВАБОДА можна выпісаць у любым аддзяленні пошты і «Белсаюздруку».

Кошт падпіскі:

1 месяц – 25 тыс.рублёў
3 месяцы – 75 тыс.рублёў
6 месяцаў – 150 тыс.рублёў

Падпісны індэкс 63887

Падпіску можна аформіць на любы тэрмін – ад аднаго месяца да шасці.

Школы – на самапас

У самым канцы навучальнага года айцы горада Мазыра раптам вырашылі заняцца праблемамі харчавання школьнікаў. У выніку школам парэкамендавалі старацца самім.

Пытанні арганізацыі школьнага харчавання разгледзелі на спецыяльным паседжанні райвыканкама. Было канстатавана, што на харчы школьнікам выдзяляюцца жабрацкія сумы — усяго паўтары тысячы рублёў у дзень. Вядома ж, на такія грошы не пад'ясі. А ў школах яшчэ пастаянна псуецца абсталяванне ў сталоўках, і запазычнасць па рамонце перавысіла 20 млн. рублёў.

Убачыўшы і асэнсаваўшы праблему, кіраўнікі горада зрабілі значны крок наперад, парэкамендаваўшы школам забяспечваць сябе самастойна: гароднінай — за кошт прышкольных участкаў, садавінай — заключыўшы дагаворы паміж школамі і гаспадаркамі, у якіх ёсць сады.

Старшыня Мазырскага райвыканкама М.Саўчык запэўніў, што неўзабаве з'явіцца спецыяльнае распараджэнне, і гаспадаркі раёна будуць абавязаныя бясплатна пастаўляць у школы бульбу, гародніну, а таксама мяса — з разліку 50 г у дзень.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

Ад ПТВ да ВНУ – адзін крок

Станоўча скончыўся эксперымент па пераўтварэнні звычайнага Жлобінскага ПТВ № 187 у вышэйшае прафесійнае аграрна-тэхнічнае вучылішча.

Сутнасць эксперыменту была ў стварэнні другой ступені навучання, гэта значыць, што найбольш здольныя навучэнцы займаюцца па праграме тэхнікума. Вучылішча стала базавай вучэбнай установай Беларускага аграрна-тэхнічнага універсітэта, і выпускнікі ПТВ, паступіўшы ва універсітэт, навучаюцца там толькі 3 гады.

Сёлета адбор на другую ступень навучання з 640 прайшлі 100 навучэнцаў. Прызнаннем поспеху навучальнай установы новага тыпу стала стварэнне на яе базе абласнога вучэбна-метадычнага цэнтра прафтэхадукацыі і выдавецкага цэнтра па выпуску метадычнай літаратуры.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

Амністыя завяршылася. У камерах усё роўна цесна

У ходзе абвешчанай амністыі з месцаў пазбаўлення волі, размешчаных у Гомельскай вобласці, вызваленыя 2.506 чалавек.

Падводзячы вынікі амністыі, якая цягнулася паўгода, намеснік начальніка УУС Гомельскага аблвыканкама Сяргей Кадушкін адзначыў, што, на жаль, яшчэ 3.417 чалавек, якія першапачаткова падлягалі амністыі, не вызваленыя з прычыны розных спагнанняў або адсутнасці неабходных дакументаў.

Тым не менш амністыя крыху палепшыла «жыллёвыя» умовы ў месцах пазбаўлення волі, хаця на сёння дэфіцыт плошчаў складае 30 працэнтаў. Каб не дапусціць росту крыміногенных сітуацый у рэгіёне, аблвыканкам аказаў садзейнічанне ў працаўладкаванні 209 амнісціраваным жыхарам Гомельшчыны, а таксама ўсе вызваленыя атрымалі аднаразовую матэрыяльную дапамогу.

БелаПАН

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА
4 чэрвеня 1997 г., № 59

Гудят стропила: денег нет

Рынок жилья — рынок без покупателей

На прошлой неделе состоялась первая пресс-конференция нового министра архитектуры и строительства Виктора Ветрова. Она проходила в атмосфере умеренного казенного оптимизма и оставила после себя больше вопросов, чем ответов.

По словам министра, задачи строительному комплексу поставлены президентом и правительством исходя из прогноза развития страны до 2000 года. Впервые за последние годы *«конкретные показатели доведены до каждого исполнителя, задания по строительству объектов соцкультбыта установлены в разрезе областей»*, утверждены графики выполнения работ, которые еженедельно проверяются.

Как можно было понять, благодаря восстановленному централизованному планированию, а в большей степени вниманию к вопросам строительства со стороны президента, все показатели выполняются и перевыполняются. И не только в количественном отношении: за повышением качества строительства отныне будет следить специально создаваемый при министерстве госстройнадзор. Короче, все как в советские времена.

Но времена-то вроде рыночные. Поэтому и о состоянии дел судят по иным показателям. В частности, рентабельность в строительстве нижайшая, всего 5,1%, что исключает всякую возможность обновления фондов стройкомплекса. Короче, денег нет. Поэтому одна из главных проблем — ценообразование.

Но оно полностью контролируется президентом. По мнению министра, это не зло, не благо, а неизбежная реалия «переходного периода». Но строителей обижают: цены на вводимые площади растут не в пример медленнее, чем на продукцию промышленности и потребительские товары. Все это напоминает многолетние стенания аграриев по поводу того, что диспаритет цен разрушит сельское хозяйство. Разрушил-таки. Строители — следующие?

Понятно, что проблема ценообразования существует и в рыночной экономике, но решает ее в основном покупатель, который может заплатить лишь столько, сколько может. И производитель, если он хочет остаться на рынке, предлагает продукцию по этой и более низкой цене. У нас же в рынок играют два фигуранта: государство в лице президента (покупатель) и государственный Минстрой. А поскольку иного покупателя нет, то все рассуждения о необходимости формирования обоснованных цен вполне можно назвать словоблудием. Покупатель (государство) платит столько, сколько может, ибо казна уже давно полупуста.

Правда, министр считает, что сегодня 90% жилья оплачивается непосредственно населением. Но это или заблуждение, или сознательное искажение истины. На самом деле жилищное строительство оплачивается за счет государственных субсидий льготным категориям по принципу: сегодня — жилье, а возврат денег — в будущем.

Деньги в казну, скорее всего, не вернутся. Но так и положено при рыночном социализме: все налогоплательщики оплачивают благосостояние избранных категорий, а затем свое собственное жилье, если на это есть деньги. А деньги на жилье, если верить социологам, есть только у двух (!) процентов населения. Отстутствие покупателя, естественно, не означает, что нет людей, нуждающихся в жилье.

Нет денег — нет работы. Сидят, ждут... Дождутся ли?

Об остроте денежной проблемы стройкомплекса свидетельствует и такое обстоятельство. Строительные организации Беларуси возводят объекты для России, в частности газопровод Ямал—Западная Европа. Но поскольку они «отрабатывают» государственный долг за российский газ, заказчик обращается с ними совершенно бесцеремонно. Расчеты за выполненные работы осуществляются преимущественно по бартеру, а выплачиваемых денег не хватает даже на оплату командировочных белорусским строителям. Вот такая безденежная экономика.

Как и всякий чиновник, Виктор Ветров сыпал цифрами. В частности, ввод жилья в течение января—апреля вырос в 1,74 раза против прошлогоднего. Мы могли бы добавить, что в феврале ввод в действие жилых домов по сравнению с январем увеличился более чем в два раза, а в марте по сравнению с февралем — более чем в семь (!) раз. Но почему в апреле объемы сданного в эксплуатацию жилья упали более чем в 6 раз по сравнению с мартом, опустились ниже «прогнозного» задания.

По мнению министра, это обычное явление, объясняемое особым характером отрасли и поквартальной системой отчета. Нас такое объяснение не удовлеторило, поскольку в прошлые годы столь резких перепадов на «переломе» кварталов не случалось. А в январе нынешнего года по отношению к декабрю был рост в 2%. В чем же дело?

Нам кажется, что причина провала проста, как и в любой игре, где, играя краплеными картами или безудержно блефуя, можно сорвать куш, а можно и потерять последние портки и репутацию. Вдобавок могут еще и побить. В данном случае в роли заманчивого куша выступила казна, а блеф состоял в утверждении, что она бездонна. «Прорыв» на строительном фронте опустошил госзакрома, хотя и позволил части населения получить вожделенное жилье.

Остальным остается уповать разве что на чудо: для поддержания набранных темпов, по различным оценкам, требуется от 5 до 10 трлн. рублей. Взять их негде, разве что напечатать. Но тогда окончательно рухнет не только строительство, но все, в чем еще теплится жизнь.

Константин СКУРАТОВИЧ

Любовь с голодным не ложится

В воскресенье, в День защиты детей, президент принял участие в церемонии торжественного открытия нового здания ЗАГСа Октябрьского района столицы и присутствовал на регистрации первого брака в нем.

Брачующиеся были напутствованы теплыми словами главы государства, который обратился к их патриотическим чувствам и пожелал завести много детей. В отличие от многих других пожеланий президента, это можно назвать своевременным. Ибо с деторождаемостью в Беларуси дела обстоят из рук вон плохо. Население страны уменьшается: за счет превышения числа умерших над числом родившихся только в январе-марте нынешнего года нас стало меньше на 11,6 тыс. человек. С другой стороны, количество зарегистрированных браков увеличилось на 1,5%, но число разводов выросло еще больше — на 7,8%. В итоге на 1.000 зарегистрированных браков приходится 817 разводов, а браки бывают столь стремительными, что молодожены просто не успевают как следует познакомиться друг с другом, а не то что завести ребенка.

Новые ЗАГСы открывать необходимо, однако этого для подъема деторождаемости явно недостаточно. И, как представляется, корень зла — в развале семейной экономики. Так, по нашим подсчетам, чтобы обеспечить официально установленный минимальный потребительский бюджет новорожденному (1,13 млн. руб.), требуется труд 11 среднестатистических работников (целой футбольной команды!), которые сами при этом будут полуголодными. То есть, та незначительная разница между средней зарплатой и минимальным бюджетом в 11 раз меньше, чем требуется новорожденному даже по скромным официальным оценкам. Но ведь не на Кавказе живем. Где же взять столько бескорыстных родственников?

Тем более, что на потребительском рынке в последние дни зафиксирован новый печальный рекорд: отдельные сорта особенно любимых народом вареных колбас преодолели планку 100 тыс. руб. за кг. Таким образом, за годы «перехода» к рынку колбаса подорожала почти в 50 тыс. раз, в пять раз обогнав рост заработной платы. В истории известны разве что единичные примеры такого катастрофического обесценивания денег и труда, которые всегда заканчивались трагически для стран и народов.

Все эти цифры свидетельствуют о том, что правительство нашей страны давно уже потеряло рычаги управления экономикой, хотя нас и уверяют в обратном. Конечно, еще не пришел на Беларусь великий мор и глад, но происходит это вопреки государственной «мудрости» власть предержащих. Даже те, кто поддерживает президента в его начинаниях, не ждут от них слишком многого. Основная масса, с детства усвоившая психологию муравья, суетится в поисках заработка, приторговывает, пашет на «сотках» и дачных участках, понимая, что ждать милостей от правительства смерти подобно. За этими хлопотами как-то не до любви.

Поэтому можно, конечно, открывать ЗАГСы, но следует помнить, что все заслуги нашего правительства проистекают из нежелания народа помирать голодной смертью. В этом смысле белорусы демонстрируют замечательную и достойную лучшего применения изобретательность и устойчивость. Остается надеяться, что эти качества белорусов все же не останутся без награды.

Константин СКУРАТОВИЧ

Дэфіцыт лідэраў і палітычнай культуры

Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД), пачынаючы з мінулага года, ладзіў цыкл семінараў «Фармаванне грамадскіх лідэраў у посткамуністычнай Беларусі». Кожны семінар прысвячаўся канкрэтнаму аспекту тэмы, праводзіліся яны ва ўсіх абласных цэнтрах. Апошні прайшоў у Гомелі, абмяркоўваліся праблемы нацыянальна-рэгіянальнага ўзаемадзеяння.

Цалкам лагічна, што ў працы гомельскага семінара браў удзел намеснік старшыні Беларускага народнага Фронта Ю.Хадыка: БНФ — арганізацыя з, бадай, самай разгалінаванай і стройнай структурай. Выступаючы з дакладам «Праблемы арганізацыі і правядзення публічных кампаніяў у Беларусі», Ю.Хадыка заўважыў, што фактар асобы ў беларускай палітыцы мае значна большае значэнне, чым у развітых краінах. Прычынай гэтага прафесар Хадыка назваў няспеласць палітычнай культуры беларускага грамадства, той факт, што пераважная большасць грамадзянаў не ўсведамляе шчыльнай сувязі паміж іх жыццёвымі інтарэсамі і палітычным выбарам, які яны робяць.

«Партыя ўлады», па словах Ю.Хадыкі, усімі сіламі імкнецца захаваць гэткае становішча ў грамадстве і праводзіць *«свядомае, арганізаванае супрацьдзеянне ўсталяванню дэмакратычных нормаў палітычнага жыцця»*. Менавіта таму як за Кебічам, так і за Лукашэнкам «партыя ўлады» жорстка працівілася змяненням у Закон аб выбарах, накіраваным на скасаванне абавязковага 50-працэнтнага ліміту яўкі выбаршчыкаў і на ўвядзенне мажарытарна-прапарцыянальнай выбарчай сістэмы. Калі б палова парламента абіралася па партыйных спісах, гэта спрыяла б стварэнню нефармальнага палітычнага спектра і развіццю палітычнай культуры грамадства.

На сённяшні дзень, як лічыць Ю.Хадыка, сітуацыя вымагае аб'яднання ўсіх дэмакратычных сілаў дзеля супрацьдзеяння наступу дыктатуры і захавання незалежнасці. Дакладчык падкрэсліў, што цяперашняя сітуацыя стала магчымай таксама з-за неразвітасці палітычнага спектра ў краіне, і праілюстраваў гэта прыкладам, як у Вярхоўным Савеце збіраліся подпісы за імпічмент Лукашэнкі: нягледзячы на тое, што лідэры аграрнай, камуністычнай і сацыял-дэмакратычнай фракцыяў былі за імпічмент, неабходнай колькасці дэпутацкіх галасоў набраць не ўдалося з прычыны нізкай палітычнай культуры дэпутатаў. *«Яны не разумелі сваёй адказнасці перад партыямі, якія прывялі іх у ВС, і перад народам, які даручыў ім абарону законнасці і правапарадку. Яны адчувалі толькі страх за свой асабісты лёс»*, — сказаў Ю.Хадыка. Дададзім, што не толькі страх, але і жаданне, служачы рэжыму, застацца ля кармушкі.

Звяртаючыся да непасрэднай тэмы семінара, Ю.Хадыка зазначыў, што паміж цэнтрам і рэгіёнамі павінна быць моцная і пастаянная сувязь. Рэгіянальныя лідэры ў дэмакратычнай арганізацыі выконваюць шэраг важных функцыяў. Гэта генерацыя ўласных ідэяў і карэкціроўка тых, што прапануюцца цэнтрам; збіранне і аналіз інфармацыі; распрацоўка і рэалізацыя планаў акцыяў і кампаніяў і інш. Лідэр нацыянальнага маштабу, па меркаванні Хадыкі, павінен быць *«яркім выразнікам значнай для грамадства ідэі»*, якая павінна падавацца ў яснай і зразумелай форме.

Старшыня Гомельскага клуба выбаршчыкаў С.Гальдадэ ў дакладзе, прысвечаным грамадскім аб'яднанням, заўважыла, што пэўная частка людзей уступае ў грамадскія аб'яднанні не паводле перакананняў, а, як і раней, — у спадзяванні на нейкія льготы і выгоды. Але на сённяшні дзень грамадскія арганізацыі ў асноўным ствараюцца для таго, каб людзі супольна вырашалі тыя ці іншыя праблемы. Дакладчыца прывяла прыклады, калі адна грамадская арганізацыя стварыла цэнтр рэабілітацыі хворых дзяцей, другая пастаянна займаецца працаўладкаваннем інвалідаў, трэцяя — сацыяльнай абаронай пацярпелых ад Чарнобыльскай катастрофы.

Аднак, як падкрэсліла С.Гальдадэ, адна з найважнейшых умоваў павышэння эфектыўнасці працы і прэстыжу грамадскіх аб'яднанняў — магчымасць заканадаўчага вырашэння пытанняў, ініцыятарамі якіх яны выступаюць. За цяперашнім часам гэта стала практычна немагчымым як на рэгіянальным, так і на нацыянальным узроўні.

С.Гальдадэ лічыць, што людзей трэба заахвочваць займацца грамадскай дзейнасцю не толькі ў вырашэнні грунтоўных палітычных пытанняў, але і *«праз прызму простых паняццяў — маё здароўе, мой дом, маё дзіця, мая работа, мае правы»*.

З дакладамі на семінары выступілі таксама кіраўніца беларускага «Яблока» В.Абрамава, начальнік сацыялагічнай службы «Зеркало» інфармацыйнага агенцтва БелаПАН Л.Міхейчыкаў, вядучы навуковы супрацоўнік НІСЭПД Н.Яфімава.

Падчас абмеркавання дакладаў удзельнікі праяўлялі вялікую зацікаўленасць, хоць і не надта трымаліся ў межах акрэсленай тэмы. Яно натуральна — у кожным горадзе, дзе праводзіцца семінар, вызначаецца пэўны вузкі аспект, але людзі хочуць выказацца не толькі па ім, а выкласці ўсе свае меркаванні па праблеме фармавання лідэраў, ды і наогул па палітычных пытаннях.

Шмат было сказана пра лукашэнкаўскі рэферэндум. Гомельцы прыводзілі шматлікія факты грубых парушэнняў заканадаўства, якімі суправаджаўся «рэферэндум». У кантэксце гэтай гутаркі В.Абрамава правяла паралелі паміж лукашэнкаўскім мерапрыемствам 24 лістапада 1996 г. і рэферэндумам, што прапаноўваў БНФ у 1992 г. *«Нельга кранаць уладу, нельга разбураць устоі»*, — заявіла В.Абрамава. Ёй слушна запярэчыў Ю.Хадыка: пры падрыхтоўцы бэнэфаўскага рэферэндуму ўсё рабілася ў строгай адпаведнасці з законам, і незаконнай была якраз адмова з боку Вярхоўнага Савета. А лукашэнкаўскі «рэферэндум» ад пачатку да канца быў супрацьзаконным — таму ніякія паралелі тут неправамерныя.

Што ж тычыцца дыскусіі па тэме семінару, дык гаворка вялася пра слабую каардынацыю паміж цэнтрам і рэгіёнамі, пра тое, што ў цэнтры трэба рабіць аналіз на апярэджанне падзеяў і дасылаць яго ў рэгіёны, а таксама накіроўваць у правінцыю людзей, якія б вучылі мясцовых актывістаў палітычным тэхналогіям. Прафсаюзныя актывісты настойвалі на неабходнасці больш шчыльнай звязкі палітыкаў з прафсаюзамі, а маладзёжных арганізацыяў — раілі шукаць нетрадыцыйныя формы работы з моладдзю.

У заключным слове дырэктар НІСЭПД А.Манаеў падвёў вынікі семінара. Ён падкрэсліў, што праблема дэфіцыту грамадскіх лідэраў зусім не зводзіцца толькі да палітыкі — ад гэтага церпяць і бізнес, і моладзь, і СМІ, і шмат хто яшчэ. Таму да вырашэння гэтай праблемы, апроч палітыкі, трэба далучаць і іншыя сферы дзейнасці. І наогул, лідэры могуць «выгадавацца» толькі на адпаведнай сацыяльнай базе, стварэнне якой вымагае доўгачасовай і карпатлівай працы. Тэрміновыя дзеянні, накшталт вулічных акцыяў, не павінны гэткай работы выключаць, — мяркуе Манаеў. Што ж тычыцца ўзаемадзеяння цэнтра і рэгіёнаў, дык тут, як сказаў Манаеў, апазіцыя прайграе ўладам. Без работы ў гэтых накірунках праблему фармавання лідэраў вырашыць будзе цяжка — а вырашаць яе неабходна. Нельга разлічваць на тое, што ў Беларусі аўтаматычна надыдуць лепшыя часы. *«Нічога само па сабе не надыходзіць — усё робіцца людзьмі»*, — рэзюмаваў А.Манаеў.

Вадзім КАЗНАЧЭЕЎ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Лагерныя клопаты

Куды адправіць дзіця на адпачынак?

Сутыкаючыся на мяжы вясны і лета з гэтай праблемай, мы ў першую чаргу ўзгадваем пра дзіцячыя лагеры, дзе калісьці самі праходзілі «школу маладога піянера-байца». Калі не здраджвае памяць, для нашых бацькоў гэта была зусім не праблема — адправіць нас у лагер. Усё роўна, што пакараць за дрэнныя паводзіны ці двойкі.

Сёння, аказваецца, трапіць у дзіцячы лагер зусім нялёгка. Нават грошы не заўсёды дапамагаюць набыць пуцёўку туды, куды пажадаў твой нашчадак. Напрыклад, гэта цалкам немагчыма, калі нехта захацеў у «Зубраня». Гонар і краса, «флагман дзіцячай аздараўленчай сістэмы Беларусі» «хаваецца» ад багатых беларусаў за сістэмай размеркавання недарагіх пуцёвак праз міністэрства адукацыі — для лепшых вучняў, праз чарнобыльскі камітэт — для дзяцей з забруджаных раёнаў ды праз розныя фонды і адноўленую піянерскую арганізацыю — для іншых льготнікаў. Як і ў савецкія часы, у кагорту шчаслівчыкаў трапляе нямала дзяцей вышэйшых чыноўнікаў, іхніх сваякоў і знаёмых.

Калі ў вашага дзіцяці няма шанцаў патрапіць у гэты «кантынгент», то лепш пакладзіце вока на лагеры, што падпарадкоўваюцца дзяржаўным прадпрыемствам.

Аптымістычная статыстыка

310 дзіцячых лагераў, згодна з дадзенымі федэрацыі прафсаюзаў (ФПБ), прымуць гэтым летам ажно 73 тысячы дзяцей. Усяго ж, улічваючы ўклад школьных лагераў, за сезон аздаравіцца больш за трыста тысячаў маленькіх грамадзянаў Беларусі. Пагодзімся, нядрэнны вынік, улічваючы цяжкае эканамічнае становішча ў краіне. (Прыкладна столькі ж дзяцей, па звестках ФПБ, аздараўлялася ў лепшыя савецкія часы.)

Захаваецца і традыцыя таннага, амаль што бясплатнага адпачынку. Пры сярэднім сабекошце 2,7—3,5 мільёна рублёў, бацькі за дзіцячую пуцёўку заплацяць не больш як 10%. Ва ўсялякім разе, гэтак паабяцаў старшыня ФПБ Уладзімір Ганчарык на апошнім паседжанні прэзідыума федэрацыі, якое спецыяльна прысвячалася «лагернаму» пытанню.

Праблема адна — грошы

Выканаць шчодрую ўстаноўку начальства прафсаюзам будзе нялёгка: грошай у іхніх кішэнях кот наплакаў, і таму разлік робіцца на тое, што ўладальнікі дзіцячых лагераў — прадпрыемствы — увойдуць у «дзіцячае становішча» і не будуць рабіць бізнес на нашчадках сваіх работнікаў. Вось толькі хто б увайшоў у становішча адміністрацыі прадпрыемстваў...

Рамонт лагерных карпусоў, аплата працы персаналу, забеспячэнне палівам кацельняў — толькі частка расходаў, якія штогод дадатковым цяжарам кладуцца на заводскія бюджэты. З-за фінансавых цяжкасцяў аздараўленчая база паўсюль даўно не развіваецца, а толькі падтрымліваецца — абы не развалілася. У выніку нават на буйных прадпрыемствах, дзе раней не было праблем з дзіцячым адпачынкам, цяпер адчуваецца напружанасць з пуцёўкамі.

Але, канешне ж, гэтыя цяжкасці не параўнаць з праблемамі, якія перажываюць супрацоўнікі арганізацыяў, дзе няма сваіх лагераў. Вось ужо каму даводзіцца адчуць сваю «другасортнасць», бегаючы па прыёмных кіраўнікоў з заявамі. Хаця некаторыя арганізацыі знаходзяць прыстойнае выйсце і з такой складанай сітуацыі.

Прафсаюз работнікаў культуры, напрыклад, гэтым летам будзе арандаваць пад дзіцячыя лагеры тры дамы адпачынку і абяцае ў выніку задаволіць пуцёўкамі ажно чатыры сотні ахвотных, сярод якіх — дзеці звычайных бібліятэкараў, загадчыкаў клубаў і іншых культработнікаў. *«Неяк выкручваемся, самым бедным нашым арганізацыям дазваляем купляць пуцёўкі ў крэдыт»,* — паведаміла намеснік старшыні прафсаюза Марыя Свірыд. Пры сабекошце ў 2 мільёны пуцёўкі на першую змену каштавалі каля 600 тысяч, але і гэтыя льготы толькі для «сваіх». Чужым пуцёўкі ўвогуле не прадаюць.

Самыя вялікія цяжкасці з пуцёўкамі чакаюць тых, хто працуе ў недзяржаўным сектары. Як быць ім?

Калі пашанцуе...

Абзваніўшы пяць буйнейшых прадпрыемстваў Мінска (трактарны завод, МАЗ, «Гарызонт», завод халадзільнікаў «Атлант» і аб'яднанне імя Кірава) з пытаннем пра летні лагер, я толькі па адным адрасе атрымаў цалкам станоўчы адказ. *«Купіць пуцёўку ў наш лагер на другую ці трэцюю змены будзе не праблема,* — запэўніла мяне старшыня прафкама аб'яднання імя Кірава Ірына Мухіна. — *Вашаму дзіцяці гарантуецца пяціразовае харчаванне, гульні, відэа, лячэнне травамі і, магчыма, нават катанне на кацеры па Мінскім моры. Пуцёўка, канешне, за поўны кошт — прыкладна 2 млн. 500 тысяч рублёў. Але ж вы не «кіравец»...»*

Тое ж самае чакае і «нетрактаразаводцаў» на МТЗ. Калі наплыў «сваіх» на другую і трэцюю змены будзе меншы, чым на першую, то за два з паловай мільёны пуцёўку ў піянерлагер «Беларусь» вам, магчыма, прададуць. *«Многае залежыць і ад надвор'я,* — патлумачыла Галіна Маісеева з прафкама МТЗ. — *Сонечным летам попыт на пуцёўкі большы, а сваім заўсёды аддаецца перавага».* Так што калі пашанцуе — і вашае дзіця паедзе адпачываць у «Беларусь». А за тое, што ў палатах будзе цёпла, не турбуйцеся — *«вугаль ужо завезены».*

Магчыма, нейкую колькасць пуцёвак за поўны кошт зможа прадаць прафкам аб'яднання «Гарызонт». На балансе гэтага славутага прадпрыемства знаходзяцца ажно два лагеры. Праўда, частку месцаў ужо арандуюць прадпрыемствы з Магілёўскай і Гомельскай абласцей, але не выключана, што сёе-тое прададуць і прыватным асобам. Па словах намесніка старшыні прафкама Валянціны Сідаркевіч, пуцёўкі могуць «засвяціць» у пачатку ліпеня. Ва ўсякім разе, на лагер «Волна», дзе ёсць адкрыты басейн з падагрэвам, можна разлічваць. Не з-за басейна, а з-за таго, пэўна, што пуцёўка туды каштуе ажно 3 мільёны.

А вось у прафкаме аўтазавода загадваць на лета нават не бяруцца, бо ў распараджэнні гэтага прадпрыемства два лагеры на 600 месцаў, але ж і мазаўцаў колькі! Да таго ж, у першай змене ажно палову месцаў «канфіскаваў» Мінскі гарвыканкам для размяшчэння дзяцей, якія возьмуць удзел у святце горада 3 ліпеня. Няма пуцёвак для «чужых» дзяцей і на аб'яднанні «Атлант»: *«Сваім ледзь хапае»,* — ледзяным голасам адказаў мне супрацоўнік прафкама завода халадзільнікаў.

І ўсё ж я, бадай, памылюся, калі заяўлю, што ў Мінску здабыць пуцёўку ў дзіцячы лагер староннямy чалавеку амаль немагчыма. Не кажучы ўжо пра гігантаў нашай прамысловасці, нават прадпрыемствы-сераднячкі маюць на балансе дзіцячыя лагеры. Калі засесці на тэлефоне і ўпарта пытацца ўсіх патэнцыйных «лагерадаўцаў», не выключана, што пашанцуе. Канешне ж, плаціць давядзецца не прафсаюзныя дзвесце пяцьдзесят тысяч...

Шлях «сучасных герояў»

Шлях гэты з даўніх часоў вядомы — «у абыход». Па першае, дзіцячым аздараўленнем цяпер займаецца безліч усялякіх фондаў, і зусім невыпадкова, што сярод «чарнобыльскіх» дзяцей немалая частка прадстаўляе не толькі мясцовую эліту забруджаных раёнаў, але і сталічныя ўладныя сферы. Сярод «дзяцей» адміністрацыі прэзідэнта, напрыклад, стала вельмі модным адпачываць з чарнобыльцамі ў Італіі.

Другі не менш папулярны шлях — з татам, матуляй або нават бабуляй паехаць у санаторый. У савецкія часы ў санаторыі для партыйнай эліты бацькоў з дзецьмі не прымалі. Новае маладое кіраўніцтва краіны гэты недахоп выправіла, і цяпер ва ўсе санаторыі, што падпарадкаваныя ўпраўленню справамі прэзідэнта, за 60% прадаюцца і дзіцячыя пуцёўкі. У выніку пляжы крымскай ды сочынскай «Беларусі» ці санаторыя «Белая Русь» у Туапсэ па колькасці загарэлых дзіцячых целаў нагадваюць пляжы «Артэка». Пуцёўкі ў чарнаморскія санаторыі, нягледзячы на кошт у 9 мільёнаў, як нам удалося даведацца, раскупляюцца ў прэзідэнцкай адміністрацыі без праблемаў.

Праўда, каб выкарыстаць гэтую магчымасць, трэба спачатку ўладкавацца ў адміністрацыю — хаця б дворнікам...

А калі і гэта не атрымаецца, застаецца хіба толькі запісаць свайго балбеса ў піянеры. На наступны год, калі праявіць актыўнасць «в борьбе за дело...», заваюе аўтарытэт і атрымае адпаведную рэкамендацыю, то, можа, сам прынясе са школы разам з дзённікам, поўным пяцёрак, яшчэ і пуцёўку ў які-небудзь беларускі «Артэк». Пры сённяшнім палітычным курсе іх у хуткім часе павінна стаць шмат.

Алесь ПАЎЛОВІЧ

Жак Вильнев — кумир молодежи

Досье

Жак родился 9 апреля 1971 года в городке Сен-Жан-сюр-Ришелье (канадская провинция Квебек) в семье автогонщика Жиля Вильнева.

В 1982 году осиротел — отец, выигравший шесть «Гран-при» в составе «Феррари», погиб во время квалификационного заезда в Бельгии. В 15 лет Жак дебютировал за рулем «Альфа-Ромео». В 1995 году он выиграл гонку «Индикар-500», а с прошлого года начал выступать в «Формуле-1» за команду «Уильямс-Рено». Результат — второе место! Считается главным фаворитом сезона-97.

Рост 168 сантиметров. Вес 67 килограмм. Живет в Монте-Карло (княжество Монако). Холост. Увлечения — музыка, компьютерные игры. Отношение к спиртному: немного и редко (считает, что алкоголь — могила для гонщика).

Выиграв в мае «Гран-при Испании», Жак Вильнев единолично возглавил список лидеров королевских гонок. И неудивительно, что Вильнев пользуется бешеной популярностью среди молодых людей во всем мире.

Internet и современные средства коммуникации дают нам возможность расспросить самого Жака Вильнева — пусть заочно.



Как и всякий канадец, Жак обожает лед и коньки. Летом он частенько выезжает в снежные Альпы — это ему по средствам.

— Для тебя «Формула-1» прежде всего работа?

— Конечно. Вот езда за рулем — это радость. А сам чемпионат — просто каторжный труд. Спонсоры, телевидение, сьемки, пресса... Это все ужасно надоедает.

— А как ты относишься к своей популярности у молодых людей? Ведь сейчас ты — просто молодежный герой.

— Герой? Глупости! Ко всему этому я отношусь очень спокойно. Я же не спасал мир от катастрофы!

— Тебе всего 26 лет, ты носишь шорты и майки, катаешься на роликах, любишь компьютерные игры, классно водишь самые «крутые» автомобили в мире. Молодежь видит в тебе своего парня, однокурсника, который моментально добился успеха, стал миллионером, но при этом не задрал нос.

— Насчет моего студенческого облика вы, наверное, правы. Я действительно стараюсь смахивать на парня из студгородка. Может, это оттого, что я всегда мечтал вращаться в университетской богеме, но был лишен этого. Да я несерьезный человек — одни глупости в голове.

— Что значит глупости?

— Ну, не глупости, а, скорее, детство. Понимаю, что надо взрослеть, но никак не получается. Стоит только встретиться с друзьями детства — такую гулянку закатываем! Я очень люблю своих друзей и дорожу ими. То, что они живут в Канаде, а я — в Европе, не имеет никакого значения. Мы никогда не расстаемся.

— Недавно вышел рекламный ролик «Рено», где ты сыграл главную роль. Понравилось амплуа кинозвезды?

— Очень. Для меня звездами всегда были кинодетективы, а для них, наверное — я.

— Ты очень требователен к людям?

— К деловым партнерам — безусловно. Эта требовательность, наверное, результат того, что я учился в частной школе, вдали от матери. Дети там раньше взрослеют, так как вынуждены завоевывать авторитет, право на лидерство.

— Там ты был вожаком?

— Да уж не бараном, это точно. Во всяком случае, всегда старался контролировать ситуацию и понимать, что можно, а что нельзя.

— Каким себя видишь через 20 лет?

— Лысым... И, конечно, счастливым. Уж точно не гонщиком: день истечения контракта станет последним моим днем в «Формуле-1». Займусь серьезно музыкой или информатикой — пока еще не решил. Мир быстро меняется, и загадывать наперед, я считаю, бесполезно.

— Ну, а детей у тебя много будет?

— Много не обещаю, но то, что они будут — это факт.

Подготовил
Дмитрий ЧЕРНЕЦОВ

ВАШ ПУТЕВОДИТЕЛЬ В ТЕЛЕВИЗИОННОМ МИРЕ

Обладателям телевизионных приемников посвящается!

ТЕЛЕ НЕДЕЛЯ TV

ТОЛЬКО ДЛЯ ПОДПИСЧИКОВ

ТОЛЬКО ДЛЯ ВАС: ПРОГРАММА ВСЕХ ТЕЛЕКАНАЛОВ ИЗ САМЫХ ДОСТОВЕРНЫХ ИСТОЧНИКОВ, КРОССВОРДЫ, ЮМОР...

НА ЭТОТ РАЗ НАШИ ПОДПИСЧИКИ РАЗЫГРАЮТ МНОЖЕСТВО ПРИЗОВ, А ТЕЛЕВИЗОР ДОСТАНЕТСЯ САМОМУ УДАЧЛИВОМУ...

МЫ ДУМАЕМ О ВАС:

ЕЖЕНЕДЕЛЬНИК ВЫХОДИТ НА 16 СТРАНИЦАХ ФОРМАТА А4 В ИСКЛЮЧИТЕЛЬНО УДОБНОЙ ДЛЯ ВОСПРИЯТИЯ ФОРМЕ, КОГДА КАЖДОМУ ТЕЛЕВИЗИОННОМУ ДНЮ ПОСВЯЩЕНА ОТДЕЛЬНАЯ СТРАНИЦА, НЕ ЗАСОРЕННАЯ РЕКЛАМОЙ И ПРОЧЕЙ ОТВЛЕКАЮЩЕЙ ИНФОРМАЦИЕЙ.

ПРИЗ

ИНДЕКС 63119
ПОДПИСКА НА 3-Й КВАРТАЛ
ВСЕГО 30.000 РУБЛЕЙ

ОСТАВАЙТЕСЬ С НАМИ!

© СВАБОДА Падпісны індэкс 63887 E-mail: edit@svaboda.minsk.by СВАБОДА ў Internet: http:\\www.gis.minsk.by Спасылка на газету СВАБОДА абавязковая Наклад 36.220
Нумар падпісаны ў друк 03.06.97 (15:00) Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) ЛВ № 215 Заказ 311